УДК 902.34:904(476)

А. А. Трусаў,
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# ГІСТОРЫЯ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ ЗАМКАЎ

Адзін з першых даследчыкаў абарончай архітэктуры Беларусі Міхась Ткачоў называў нашу радзіму краінай замкаў, і ён меў рацыю. Большасць беларускіх замкаў XIV–XVIII стст. былі драўлянымі, таму канчаткова зніклі пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай. Мураваныя замкі моцна пацярпелі падчас шматлікіх войнаў і ў XIX ст., у асноўным былі разбураныя і згубілі гаспадароў.

З усіх беларускіх замкаў найбольш пашанцавала Нясвіжскаму, пабудаванаму Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткам у канцы XVI ст. Узводзілі замак італьянскія майстры [1, с. 7]. Спачатку гэта быў чатырохвугольнік (170х120 м), абведзены высокім земляным валам з бастыёнамі па кутах. Добра ўмацаваны, у XVII ст. ён паспяхова вытрымаў аблогу ворагаў. Аднак у 1706 г. шведскія войскі захапілі замак і ўзарвалі яго бастыёны. У 20-я гг. XVIII ст. замак быў адноўлены. Радзівілы зрабілі цудоўны палацава-замкавы комплекс, дзе захоўваліся іх шматлікія багацці. У 1812 г. чарговы ўладальнік замка Дамінік Радзівіл перайшоў на бок Напалеона. Пасля вайны царскія ўлады канфіскавалі і разрабавалі замак.

Пасля 1860 г. Радзівілы ўжо іншай радавой лініі вярнуліся з Германіі ў Нясвіж і адрадзілі замак. Пасля 1875 г. Антоній Радзівіл і яго жонка Марыя дэ Кастэлян адрамантавалі палац і заснавалі парк у паўночна-ўсходняй частцы. У пачатку XX ст. з’явілася яшчэ некалькі новых паркаў каля замка. Пасля Рыжскай дамовы 1921 г. Нясвіж апынуўся ў складзе Польшчы, і да верасня 1939 г. у ім зноў жылі Радзівілы. Ацалеў замак і ў Другую сусветную вайну.

Пасля вайны і да 1997 г. палац выкарыстоўваўся як санаторый. Пасля яго закрыцця пачалася рэстаўрацыя. У 2001 г. замкавы комплекс перадалі Нацыянальнаму гісторыка-куль-

турнаму запаведніку «Нясвіж». У час рэстаўрацыі драўляныя дэталі апрацавалі спецыяльным растворам, перакрыцці і кроквы замянілі на жалезабетонныя, памянялі дах – накрылі яго дахоўкай, зрабілі круглыя вокны з вітражамі. Была зроблена гідраізаляцыя сцен і падмуркаў палаца.

У 2004 г. галоўную вежу замка аднавілі паводле гравюры Макоўскага ў стылі рэнесансу. Аднак навукоўцы выступілі супраць гэтага і патрабавалі зрабіць вежу ў стылі барока, як гэта было ў XVIII ст., у часы Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Навукова-метадычны савет па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры прыняў нарэшце рашэнне змяніць выгляд замкавай вежы па стане на XVIII ст. Навуковым кіраўніком адраджэння Нясвіжскага замка стаў вядомы беларускі рэстаўратар Сяргей Друшчыц. Рэстаўрацыя палацава-паркавага ансамбля вялася з 1997 г. па 2012 г., у 2006 г. ён трапіў у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Зараз у Нясвіжскім замку дзейнічае каля 30 экспазіцыйных залаў, якія штогод наведваюць тысячы турыстаў.

Мірскі замак быў закладзены магнатам Ільінічам каля паселішча Мір у першай палове XVI ст. у стылі беларускай готыкі. Аднак будаўніцтва замка не было скончана, і ў другой палове XVI ст. ён перайшоў да Радзівілаў. Новы ўладальнік Радзівіл Сіротка ў канцы XVI ст. значна перабудоўвае замак у стылі рэнесансу і барока. Вакол замка насыпаюць валы з бастыёнамі, вакол іх робяць равы з вадою. Унутры замка, каля паўночнай і ўсходняй сцен, зрабілі трохпавярховы палац з глыбокімі сутарэннямі, а звонку – уздоўж паўднёвай і заходняй – аднапавярховыя службовыя прыбудовы. Галоўная ўваходная вежа атрымала дадатковае ўмацаванне паўкруглай формы – прадбрам’е. Інтэр’еры палаца аздабляюць шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя зялёнапаліванай і паліхромнай кафляй [2, мал. 12, 13].

Першы раз замак моцна пацярпеў ад ваенных дзеянняў у сярэдзіне XVII ст. і каля 30 гадоў быў закінуты. Аднаўляць яго пачалі ў 1681 г. Асноўныя работы ішлі з 1686 г. па 1689 г. Аднак неўзабаве ў 1706 г. у Мір уварваліся войскі шведскага караля Карла XII. Замак зноў быў спалены і разбураны. Аднаўленчыя работы пачаліся пасля 1729 г. і былі скончаны ў 1738 г. Аднавілі палац, дзе з’явіліся партрэтная зала і зала для танцаў, мелася 16 камінаў і 17 кафляных печаў. Аднак

паступова замак стаў прыходзіць у заняпад, пра што сведчаць яго апісанні. У пачатку XIX ст. яго крыху аднавіў новы гаспадар Дамінік Радзівіл.

У 1812 г. пад сценамі замка адбываліся ваенныя дзеянні, і ён пачаў інтэнсіўна разбурацца. Сітуацыя крыху змянілася да лепшага, калі яго набыў князь Святаполк-Мірскі. Каля замка выкапалі глыбокі стаў, пабудавалі на падмурках былога будынка канца XVI – пачатку XVII ст. новы палац і пасля смерці князя Мікалая Святаполк-Мірскага ў 1904 г. – сямейную капліцу-пахавальню. Гаспадаром стаў сын Мікалая – князь Міхаіл. У 1921 г. ён вярнуўся ў Мір і вырашыў пакрысе аднавіць замак. У 1924 г. праект адбудовы склаў варшаўскі архітэктар Тэадор Бурш, і работы пачаліся. Быў зроблены новы дах на драўляных кроквах. У 1933 г. князь Міхаіл перасяліўся ў замак. Для яго зрабілі асобны балкон з відам на двор і стаў перад паўднёвым фасадам палаца. Да 1939 г. часткова аднавілі тры замкавыя вежы і частку ўсходняга крыла палаца. Памёр князь у 1938 г., а ў верасні 1939 г. у замку з’явіліся новыя гаспадары.

У пачатку вайны фашысты зрабілі ў замку гета, а пасля вайны тут пасяліліся жыхары з наваколля, страціўшыя падчас баёў сваё жытло. Паступова яны збудавалі сабе дамы, і замак зноў апусцеў. У 1971 г. была зроблена часовая кансервацыя замкавых муроў, і ўсе вежы накрылі гонтай.

У кастрычніку 1978 г. Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову аб рэстаўрацыі Мірскага замка. У 1980 г. пачаліся археалагічныя раскопкі, у якіх удзельнічалі студэнты мінскіх і гродзенскіх ВНУ. Пасля гістарычных і археалагічных даследаванняў і архітэктурных абмераў у 1981 г. быў зроблены праект рэстаўрацыі (аўтары – архітэктары В. Атас, С. Верамейчык, В. Калнін, археолаг А. Трусаў). За аснову ўзялі воблік замка, які склаўся ў XVII ст., з выяўленнем і фрагментарнай рэстаўрацыяй некаторых фрагментаў XVI–XX стст. Архітэктурны аб’ект падзялілі на тры зоны. Першая – зона адраджэння. Гэта самая захаваная частка замка, і тут прапанавалі зрабіць музей. Другая – зона адаптацыі, частка замка, адноўленая ў 20–30-х гг. XX ст. Тут хацелі размясціць вытворчыя майстэрні мастацкага прафтэхвучылішча. Трэцяя зона – прастора трансфармацыі, гэта частка замка, пазбаўленая ўнутраных перакрыццяў і сцен. Тут планавалі размясціць музей рэстаўрацыі замка, сувенірныя

крамы і кавярню. Аднак за доўгія часы рэстаўрацыі, якая пачалася з закладкі першай цагліны 25 чэрвеня 1983 г., сітуацыя змянілася. Быў прызначаны новы кіраўнік праекта – архітэктар Д. Бубноўскі. 12 красавіка 1993 г. у прысутнасці кіраўнікоў Рэспублікі Беларусь урачыста адкрылі першую музейную экспазіцыю ў адноўленай паўднёва-заходняй вежы. У 2000 г. замкавы комплекс «Мір» уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Урачыстае адкрыццё ўсяго музейнага комплексу адбылося ў снежні 2010 г. з удзелам Кіраўніка краіны і міністра культуры.

Вельмі складаны шлях кансервацыі і рэстаўрацыі прайшоў Лідскі замак. Гэты замак-кастэль памерам прыкладна 80х80 м быў збудаваны вялікім князем Гедымінам у пачатку XIV ст. каля паселішча Ліда на пясчанай выспе ў балоцістай сутоцы дзвюх рэчак – Лідзейкі і Каменкі – з палявога каменю і тоўстай цэглы. Спачатку ён меў толькі адну вежу – у паўднёва-заходнім куце двара памерам 9х9 м. У канцы XIV – пачатку XV ст. замак капітальна перарабіў князь Вітаўт і прыстасаваў яго да агнястрэльнай зброі. З’явілася яшчэ адна вежа – паўночна-ўсходняя. Унутры да сцен замка прымыкалі драўляныя аднапавярховыя будынкі (казармы), шырынёй каля 4 м. Ва ўсходняй частцы двара былі два калодзежы.

У XIV–XV стст. замак не раз апынаўся ў цэнтры ваенных дзеянняў, але заўсёды аднаўляўся і быў адным з самых значных у ВКЛ. Прайшлі гады. Вялікае войска царскага ваяводы Мікіты Хаванскага пасля доўгай аблогі, што пачалася летам 1659 г., захапіла і разбурыла яго. Наступны ўдар у пачатку XVIII ст. нанеслі шведы, якія ўзарвалі замкавыя вежы. Аднак яшчэ ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. замкавыя сцены стаялі, а рэшткі вежаў захоўваліся да ўзроўню трэцяга паверха. Замак не раз малявалі мастакі, вывучалі гісторыкі. У 1891 г. Ліда моцна пацярпела ад пажараў, і гарадскія ўлады пачалі разбіраць муры замка на будаўнічыя матэрыялы. Аднак грамадскасць горада пачала пісаць скаргі ў Санкт-Пецярбург, і разбурэнне замка спынілася. Прыехалі навукоўцы, сярод іх быў Пётр Пакрышкін, які зрабіў абмеры муроў і іх фотафіксацыю. У 1909 г. замак ачысцілі ад смецця, а паверхні сцен абмазалі цэментнай рошчынай, якая збірала вільгаць, што паскорыла разбурэнне муроў.

У 20-я гг. XX ст. польскія кансерватары крыху паднавілі муры замка. У гады вайны фашысты спачатку трымалі на замкавым двары ваеннапалонных, а потым зрабілі склады боепрыпасаў. У 1953 г. Лідскі замак узялі пад дзяржаўную ахову, а ў 1967 г. перадалі пад нагляд мясцоваму будаўнічаму трэсту, які размясціў на двары спартыўную пляцоўку. Аднак замак працягваў разбурацца. У 1975 г. улады г. Ліды вырашылі зрабіць яго кансервацыю і звярнуліся ў Міністэрства культуры БССР.

Навуковым кіраўніком быў прызначаны архітэктар Сяргей Багласаў, а гісторыкам і археолагам – аўтар публікацыі. У 1977–1978 гг., а таксама ў 1980 і 1985 гг. праведзены вялікія раскопкі на замкавым двары, расчышчаны рэшткі замкавых вежаў, сабраны вялікі археалагічны матэрыял XIV–XVII стст. Упершыню ў Беларусі на базе гістарычнага факультэта БДУ стварылі спецыяльны студэнцкі будаўнічы атрад імя У. І. Пічэты, і ён прымаў актыўны ўдзел у раскопках і будаўнічых работах. Дапамагала адбудоўваць замак кіраўніцтва горада, асабліва старшыня гарвыканкама Уладзімір Логаш і галоўны архітэктар Анатоль Пархута. На тэрыторыі замка планавалі зрабіць гісторыка-археалагічны музей з паказам на мясцовасці планаў былой замкавай драўлянай забудовы. У цэнтры замкавага двара хацелі размясціць адкрыты гарадскі тэатр. Новы праект поўнага аднаўлення замка падрыхтавалі ў 2003 г.

У верасні 2005 г. у Лідзе прайшоў фестываль сярэдневяковай культуры «Меч Лідскага замка», сродкі, атрыманыя ад яго правядзення, былі накіраваны на рэканструкцыю. За два дні фестывалю ў замку пабывалі 10 тыс. чалавек. Пасля турніру рыцараў супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея пачалі ладзіць у замку рэгулярныя экскурсіі [3, с. 21–23]. Асноўныя рэстаўрацыйныя работы праходзілі ў замку вясной і летам 2010 г. Дабудавалі паўднёва-заходнюю вежу, усе сцены з драўлянай галерэяй, прывялі ў парадак замкавы двор. Скончылася рэстаўрацыя ў 2019 г. Замак зрабіўся цэнтрам рыцарскіх фэстаў, дзейнічае музейная экспазіцыя.

Старажытнае беларускае мястэчка Гальшаны ў 1555 г. стала ўласнасцю знакамітых беларускіх магнатаў Сапегаў. Адзін з іх, канцлер ВКЛ Павел Сапега, у пачатку XVII ст. будуе тут сваю рэзідэнцыю – палацава-паркавы комплекс бастыённага тыпу. За землянымі ўмацаваннямі ўзведзены двухпавярховы палац з

вялікімі вокнамі, уязной брамай, галерэямі, невялікай капліцай і вежамі па кутах. Інтэр'еры замка ўпрыгожвалі шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя паліхромнай кафляй з гербам Сапегаў, падлогі з паліваных плітак – цаглін, скляпенні, зробленыя ў галандскім стылі. У Паўночную вайну замак разбурылі шведскія войскі, у 1812 г. былі тут і напалеонаўскія салдаты. Замак заняпаў, новыя гаспадары яго не шкадавалі. У 1880 г. адзін з іх, памешчык Гарбанёў, пачаў ламаць вежы і сцены, а цэглу прадаваў на пабудову карчмы. У XX ст., калі пасля апошняй вайны ацалелую частку палаца перадалі пад вучылішча, навучэнцаў прымушалі таксама разбіраць замкавыя муры на цэглу для пабудовы на месцы замка кароўніка і Дома культуры ў цэнтры Гальшанаў. Вадкі гной з фермы вылівалі прама на былы замкавы двор і ў замкавыя лёхі. Здавалася, што будынак нічога не ўратуе. Аднак у 80-я гг. XX ст. сюды прыйшлі археолагі і рэстаўратары, зрабілі археалагічныя раскопкі, архітэктурныя абмеры і прапанавалі рэканструкцыю былога палаца Сапегаў у стылі галандскага маньерызму [4, с. 208–209].

Пасля 1991 г. Беларусь стала незалежнай краінай, былы кароўнік закрылі. Мясцовыя жыхары хутка разабралі яго сцены, а накоплены гадамі гной вывезлі на свае палеткі. Паступова замак зрабіўся турыстычным аб'ектам, а каля яго муроў кожнае лета сталі адбывацца гістарычныя фестывалі. Грамадскасць патрабавала захавання замкавых муроў. У чэрвені 2016 г. Пастановай Савета Міністраў выдаткаваны з рэспубліканскага бюджэту фінансы на кансервацыю Гальшанскага замка. У 2018 г. зрабілі гідраізаляцыю падмуркаў, аднавілі Паўночную вежу, умацавалі яе перакрыцці, пабудавалі над ёю дах з прыгожым флюгерам. 6 мая 2021 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Паўночнай вежы Гальшанскага замка і турыстычна-інфармацыйнага цэнтра пры ім.

У другой палове XVI ст. каля мястэчка Любча беларускі магнат Ян Кішка на левым беразе Нёмана будуе каменны замак у стылі рэнесансу. Памеры замка блізкія да квадрата (85х85 м). Па яго кутах узвышаліся шмат'ярусныя вежы з байніцамі. Да паўночна-заходняга замкавага мура ў канцы XVI – пачатку XVII ст. прыбудавалі каменны палац, накрыты пляскатай чырвонай дахоўкай. Падлога зроблена з тоўстых паліваных керамічных плітак, сцены замка і палаца атынкаваныя [5, с. 130].

Пазней замак перайшоў да Багуслава Радзівіла, які зрабіў тут капітальны рамонт пасля вайны 1654–1667 гг.

У XIX ст. на тэрыторыі замка пабудавалі цагляны жылы корпус, які пацярпеў падчас Першай сусветнай вайны.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны муры замка былі занядбаныя, пакуль на яго не звярнуў увагу Мікалай Вінар, што стварыў у Любчы гісторыка-краязнаўчы музей і дамогся аднаўлення галоўнай брамнай замкавай вежы. Пры яе аднаўленні знайшлі замкавы геральдычны ветранік-флюгер з датай будаўніцтва “1581”. Другім ініцыятарам аднаўлення замка стаў дырэктар завода «Лідсельмаш» Міхаіл Скрабец, які паходзіў з Любчы. Ён хацеў ператварыць замак у дом адпачынку з музеем і паркам. З 1986 г. пачаліся археалагічныя раскопкі, архіўныя пошукі, натурныя даследаванні.

У 2003 г. стварылі дабрачынны фонд «Любчанскі замак» на чале з Іванам Пячынскім, таксама ўраджэнцам Любчы. З дапамогай выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта была зроблена праектная дакументацыя для далейшых рэстаўрацыйных работ. Наступны праект з’явіўся ў 2004 г. як завяршэнне Кутняй вежы і пабудовы абарончай сцяны паміж Кутняй і Брамнай вежамі. У 2011–2012 гг. археолагі адшукалі рэшткі мураванай сцяны паміж Брамнай і паўночна-заходняй вежамі, падмурак якой таксама знойдзены. Зараз адноўлена Брамная вежа (памерам 10х10 м), што з паловы вышыні пераходзіць у васьмярык і завершана рэнесансным купалам з ліхтаром. Таксама аднавілі квадратную ў плане паўднёва-ўсходнюю вежу XVII ст., ад якой засталіся толькі падмуркі. На адбудове замка больш за 20 гадоў працуюць валанцёры-студэнты і вучні Любчанскай сярэдняй школы.

Вельмі цікавую гісторыю вывучэння, кансервацыі і рэстаўрацыі мае гродзенскі Стары замак. Збудаваны князем Вітаўтам на мяжы XIV і XV стст. на месцы былога гарадскога дзядзінца XII–XIII стст., ён меў магутныя каменныя муры, абарончыя вежы і двухпавярховы палац на замкавым двары. Палац меў гатычныя скляпенні, зробленыя з цэглы. Да сцен і замкавых вежаў прымыкалі скляпеністыя каменныя казематы рознага ваенна-гаспадарчага прызначэння. На замкавым двары месціліся драўляныя будынкі, каменная Верхняя царква, пабудаваная ў гатычным стылі. Перад княжацкімі палацам і брамай знаходзілася брукаваная плошча.

У 80-я гг. XVI ст., ужо ў значнай ступені занядбаны, замак Вітаўта быў амаль што разабраны, і на яго месцы па загадзе караля Стэфана Баторыя збудавалі новы рэнесансны замак-палац – каралеўскую рэзідэнцыю. Палац меў тры паверхі з шыкоўнымі пакоямі, дзе стаялі печы з паліхромнай кафляй, а падлогі былі зроблены з тоўстых паліваных плітак. Фасады мелі прыгожыя балконы-эркеры і дэкаратыўны роспіс у тэхніцы зграфіта [6, с. 98]. Захаваліся малюнкі палаца і замка пачатку XVII ст. Ён моцна пацярпеў падчас вайны XVII ст., але потым рамантаваўся і перабудоўваўся. У XIX ст. новыя гаспадары (расійскія вайскоўцы) ператварылі яго ў казармы, на брукаваным двары быў пляц для салдацкіх вучэнняў.

З 1921 г. да 1927 г. тут знаходзілася польская армія. Потым замак перадалі пад гарадскі музей і з 1928 г. пачалі падрыхтоўку да рэстаўрацыі. У 1933 г. кіраўніцтва Польшчы стварыла ваяводскі камітэт па аднаўленні замка да юбілею Стэфана Баторыя. Аднаўленне і даследаванне даручылі прафесару Яраславу Вайцяхоўскаму, які да верасня 1939 г. паспеў зрабіць некаторыя кансервацыйныя работы, археалагічныя раскопкі і прапанаваў адраджэнне палаца ў стылі рэнесансу.

З 1985 г. вытворчае аб'яднанне «Белрэстаўрацыя» пачало распрацоўваць праект комплекснай рэстаўрацыі ўнікальнага архітэктурнага ансамбля «Стары замак» з мэтай выяўлення і экспазіцыі трох асноўных перыядаў яго гісторыі – XII, XV і XVI стст. Навуковым кіраўніком праекта стаў архітэктар Уладзімір Бачкоў. Пасля гістарычных даследаванняў і археалагічных раскопак ён распрацаваў наступную схему рэканструкцыі: XII ст. – кансервацыя рэшткаў Ніжняй царквы і «церама», знойдзеных археолагамі; XIV–XV стст. – гатычная эпоха часоў Вітаўта і XVI ст. – замак рэнесансу Стэфана Баторыя. Але быў вымушаны адмовіцца ад гатычнага перыяду і спыніцца толькі на эпосе рэнесансу. 6 студзеня 2012 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі» на 2018–2019 гг., згодна з якой былі выдзелены сродкі на аднаўленне Старога замка.

Паводле праекта У. Бачкова аднаўленне замка планавалася ў двух варыянтах:

1) кансервацыйны павільён для захавання падмуркаў будынкаў XII ст.;

2) палац Стэфана Баторыя разам з дзвюма вежамі. Палац быў трохпавярховым, з вежай (барбаканам), крытай галерэяй, брамай, мернай «избой», камяніцай і двума пралётамі замкавага маста (адзін – драўляны, XVI ст., другі – каменны, XVII–XIX стст.). У палацы планавалася размясціць розныя тэматычныя музейныя кампазіцыі, а таксама невялікі гатэль для ўдзельнікаў навуковых канферэнцый.

Асноўныя будаўнічыя работы пачаліся летам 2015 г. У мінулым годзе адкрылі новую музейную экспазіцыю ў адноўленай частцы замка.

1. *Метельский, А. А.* Забытая Альба: очерк истории загородной резиденции Радзивиллов под Несвижем / А. А. Метельский. – Минск, 2014. – С. 7.

2. *Здановіч, Н. І.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н. І. Здановіч, А. К. Краўцэвіч, А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 71 с.

3. *Трусаў, А. А.* Мінулае і сучаснасць Лідскага замка / А. А. Трусаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2008. – № 6. – С. 21–32.

4. *Трусаў, А. А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. А. Трусаў. – Мінск : Харвест, 2015. – 463 с.

5. *Трусаў, А. А.* Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 305 с.

6. *Трусаў, А. А.* Старонкі мураванай кнігі: манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму / А. А. Трусаў. – Мінск, 1990. – С. 98.

УДК 351.853(094.2)+341.241.7

А. А. Филиппов,
*кандидат политических наук,*
*директор Института повышения квалификации и переподготовки кадров учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*

## АКТУАЛЬНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ В ОХРАНЕ ВСЕМИРНОГО НАСЛЕДИЯ ЮНЕСКО

XXI век ознаменован серьезными изменениями в подходе к самому понятию «культурное наследие» в мире. В частности, в науке пересматриваются подходы к пониманию его как чего-то незыблемого, массива застывших форм и законсервированных